Самый транзитный – все главные магистральные пути проходят через его территорию и ведут к Минску и от него. Тут одна из самых больших нагрузок на автомобильные дороги. Из зарегистрированных в Республике Беларусь 1060 млн. автомашин около 300 тысяч принадлежат Минску и Минскому району.

В районе 10 процентов подворий – наследственные домовладения. Их владельцы проживают в Минске и являются горожанами.

Из года в год наш район добивается значительных успехов в сельскохозяйственном производстве. В минувшем году был получен за 70-летнюю историю пристоличья рекордный урожай зерновых культур – 148 тысяч тонн. Район уже в третий раз за достижения в социально-экономическом развитии награжден Переходящим знаменем облисполкома, поэтому оно оставлено ему на вечное хранение. В 2004 году введены в действие более 200 тысяч м² жилья. Это свыше 30 процентов всего объема жилья по области.

На базе исполкомов сельских Советов впервые в Беларуси создано 19 коммунхозов, часть которых преобразована в самостоятельные унитарные предприятия. На их техническое вооружение из бюджета затрачено более 1,2 млрд. рублей. На данный момент по этому показателю Минский район не имеет себе равных в республике ни по обеспеченности этих структур техникой, ни по объему выполненных работ.

Как же ведется работа по благоустройству территории населенных пунктов района, наведению порядка на земле, охране окружающей среды?

Согласно Постановлению Совета Министров РБ от 30.12.2003 года, решений Минского областного исполкома от 26.01.2004 г. и Минского райисполкома от 23.01.2004 г. принята районная программа мероприятий по наведению порядка на земле и благоустройству территорий населенных пунктов на 2004–2005 гг. Сельскими и поселковыми исполкомами утверждены собственные программы с перечнем конкретных объектов и сроков. Создан постоянно действующий районный штаб по наведению порядка на земле и благоустройству, который возглавляет председатель районного Совета депутатов Галина Павловна Харитонова.

Всю проводимую в данном направлении работу можно разделить на несколько крупных блоков: благоустройство населенных пунктов; организация планово-регулярной очистки территорий деревень и поселков; наведение должного порядка на других типах территорий, таких, как садоводческие товарищества, гаражно-строительные кооперативы, зоны массового отдыха населения, полосы отвода автомо-

со столицей

бильных и железнодорожных дорог, лесные массивы и т.д.

Мы объявили ежегодный смотр-конкурс (1 апреля – 1 ноября) по благоустройству территорий сельсоветов, содержанию объектов социально-культурного назначения, расположенных в сельской местности. В постоянные общественные санитарные комиссии, созданные при сельсоветах, входят члены исполкома, землеустроители, медработники, учителя, участковые инспектора РУВД, которые проводят регулярные рейды-проверки.

Очень важную роль играют у нас уличные комитеты, старосты-старейшины населенных пунктов. Каждый уличный комитет для реализации намеченных планов привлекает жителей, проживающих на данной улице. В свою очередь многие жители организовывают домовые комитеты, что способствует улучшению санитарного состояния подъездов, дворовых и прилегающих к улицам территорий. Экологической чистотой, большим количеством деревьев, декоративных кустарников и цветов могут похвалиться горпоселок Мачулищи, Самохваловичский, Острошицко-Городоцкий, Луговослободской сельские Советы. Недавно у нас прошел районный слет старейшин населенных пунктов. Участниками слета принято обращение к согражданам, односельчанам, близким, друзьям, в котором они призывают беречь вечные ценности – небо, землю, воду, природное окружение, данное нам и нашим детям в наследство. Опыт 300 старейшин деревень и поселков района перенимали председатели всех райсоветов Минской области, которые присутствовали на слете.

Близость города Минска, пристоличье имеет как положительные, так и отрицательные стороны. Это хорошо, что рядом Минск, и мы можем пользоваться его добротами. Но сколько проблем нам создает соседство со столицей... И это в первую очередь касается неорганизованного населения – несознательных горожан, которые захламляют пригородные лесные зоны, безответственных отдыхающих на берегах водоемов, опушек лесов, эгоистической категории дачников. Все это вынудило нас создать при каждом сельском Совете коммунальные хозяйства. На их создание выделялись средства из госбюджета, Минприроды, частично изыскивали сами коммунхозы. Решена одна из сложных и запущенных проблем – уборка мусора, твердых бытовых отходов. Коммунальные унитарные предприятия обслуживают не только население деревень, садоводческие товарищества, зоны отдыха, но и приняли на свой баланс мини-полигоны, площадки временного складирования отходов. В их распоряжении трактора, автомобили, погрузчики, мусоровозы, бульдозеры, различный прицепной инвентарь. А самое главное – довольны люди, территория района становится чище и аккуратней. Это не значит, что проблем у нас уменьшилось.

Больными темами остаются садоводческие товарищества, зоны отдыха, пригородные лесные массивы... 200 тысяч жителей столицы занимаются огородничеством, садоводством. Часть из них постоянно проживает в районе на протяжении всего сезона с апреля по ноябрь. Естественно, что накапливается мусор. Если в пятницу дороги, опушки леса, поляны – чистые, то за выходные дни их не узнать. Сорят горожане, а отвечают, убирают сельчане. На сегодняшний день Минский горисполком лишь частично выполняет поручение Совета Министров РБ о передаче функций по сбору и вывозу отходов с садоводческих товариществ организациям столицы с учетом первоначального ходатайства о выделении земельных участков. Решением горисполкома от 29 января 2004 года 123 садоводческие товарищества были закреплены за УП «Минскзеленстрой», а последний организовал сбор и вывоз отходов только из 62. Город затратил на контейнеры около 17,5 млн. рублей и приобрел два мусоровоза. Этого явно недостаточно. Для сравнения: районом на организацию сбора, вывоза, размещения отходов, обустройство мини-полигонов и ликвидацию несанкционированных свалок в 2004 году затрачено более 2 млрд. рублей. Как видно, уборка мусора лежит на плечах сельчан. Это же касается и зон отдыха, пригородных лесных массивов. Тут мы тоже «бойцы» в единственном числе. Замусоренность твердыми бытовыми отходами, разжигание костров, бросовые кузова, детали автомобилей, браконьерство – вот что мы получаем здесь от горожан. Хотелось бы, чтобы эта борьба велась совместно с городскими властями, к которым мы обратились с письмами. Одним дежурством районной милиции и дружинников, инспекции по охране природы здесь не справиться. Нужно вести работу по пропаганде экологических знаний и повышению экологической культуры городского населения. В конечном итоге в выигрыше окажутся все. Мы благодарны Минприроде, городским организациям по экологии, например, за вывоз органических удобрений на наши поля.

Согласно приказу Минприроды №17 от 4.02.2004 года разработан график по обустройству кладбищ, которых на территории района 107. Из фонда охраны природы было выделено 48,8 млн. рублей на приобретение контейнеров и оборудования площадок для сбора мусора.

В районе имеется 9 водохранилищ, суммарная емкость которых – 154,06 млн. куб. м. Протекает 90 рек и ручьев. В свое время «Белгипрозем» разработал проект водоохранных зон и прибрежных полос малых рек района. Решением Минского райсовета депутатов от 9.07.2004 года утверждены правила соблюдения режима водоохранных зон и прибрежных полос. Во исполнение Госпрограммы по водоснабжению и водоотведению «Чистая вода» имеется график работ в населенных пунктах района. Во время операции «Чистый воздух» велись разъяснительные беседы с автолюбителями по соблюдению требований по охране воздушного бассейна. Вместе с Белорусским общественным объединением «Развитие – XXI век» ведется активная эколого-просветительская работа. Выпускаются санбюллетени, памятки по наведению порядка на земле. Выставляются пикеты, устанавливаются природоохранные щиты. В ближайших планах – построить в Минском районе завод мусороперерборки, сортировки твердых бытовых отходов, как это сделано в Пуховичском районе. На это отводится 100 млн. рублей. Районное ЖКХ должно заняться исполнением. Вскоре начнется летний сезон. Поэтому ведутся разработки по парковке автомобилей в водоохранных зонах отдыха.

Много чего делается в районе по наведению порядка на земле. Однако специфическое расположение района не дает ни на секунду расслабиться, заставляет вести борьбу с негативным отношением к природе, окружающей среде. В поле зрения районной власти следующие объекты: реки, водоохранные зоны, прибрежные полосы, природные охраняемые территории, охотничьи угодья, бюджетные организации, индивидуальные предприниматели, природо- и землепользователи, владельцы частных подворьев. Количество субъектов хозяйствования (юридических лиц) – 1206. Так вот, за прошлый год надзорными службами (отделом по землересурсам и землеустройству, центром гигиены и эпидемиологии, ЖКХ, РОВД, МЧС, райинспекцией ПР и ООС) за нарушения охраны окружающей среды сделаны 2259 предписаний, составлено 496 протоколов. Наложено 574 административных штрафа.

Районные работники полны энергии, чтобы выполнить программу наведения порядка на земле. Надеемся, что свое весомое слово скажет и Минский горисполком. И тогда прилегающая территория к столице будет еще краше, благороднее.

Михаил ГЛИНСКИЙ,
председатель Минского райисполкома.
Фото Владимира ФЕДОТОВА.

Богатства Беларуси будут прирастать недрами

(Окончание. Начало на 2-й стр.)

— Начнем с последнего. В Беларуси пользование недрами, включая их геологическое изучение, является исключительной прерогативой государства. Поэтому основная часть финансирования будет осуществляться за счет средств республиканского бюджета. Причем, это не простое субсидирование геологоразведочных работ. Его следует рассматривать как вложение государством возвратного капитала в разведку недр. Потому что горнодобывающие предприятия со временем возместят затраты на геологоразведочные работы. Учитывая мировую тенденцию роста цен на минеральное сырье, государство напрямую заинтересовано в развитии минерально-сырьевой базы страны, чтобы в перспективе иметь дополнительные источники пополнения бюджета. Часть геологоразведочных работ и заданий Программы, имеющих экологическую направленность, затраты на техническое переоснащение частично профинансируют фонды охраны природы. Научное обеспечение ряда заданий также возьмут на себя предприятия-исполнители. Расчетный экономический эффект от реализации геологоразведочных работ в рамках Программы 2006—2010 гг. только по основным видам полезных ископаемых составляет 1 079 739 млн. руб. при затратах на их разведку 203 310 млн. руб.

Что касается итоговых цифр реализации приоритетных направлений Программы геологоразведочных работ, то прирост или перевод в промышленные категории запасов нефти в 2006—2010 годах составит 4,05 млн. тонн, калийных солей —230 млн. тонн (в пересчете на K_2O), доломитов — 140 млн. тонн, гипса — 120 млн. тонн, мела — 350—400 млн. тонн, песчано-гравийных смесей и строительных песков — 27 млн. м³, глин керамических — 2 млн. м³, пресных подземных вод — более 100 тыс. м³ в сутки, лечебных минеральных вод — 420 тыс. м³ в сутки.

— Каковы географические адреса маршрутов геологов в Беларуси? И как можно прокомментировать некоторые сенсационные сообщения о золоте и алмазах, время от времени появляющиеся на страницах печати?

— Видимо, стоит остановиться на главных направлениях нашей работы и основных видах полезных ископаемых, добываемых в настоящее время и разведанных на будущее на территории Беларуси. Собственной нефтью Беларусь обеспечивает себя на 10 процентов, в последующем эта цифра будет снижаться. Сейчас в разработке в системе ПО «Белоруснефть» 42 месторождения, на которых добыча нефти будет осуществляться и в будущем. То есть, Припятская нефтегазоносная область будет в «строю» еще 15—20 лет. Резервом могут быть месторождения нефтеперспективных районов Оршанской и Подлясско-Брестской впадин, которые, по мере вступления в эксплуатацию, позволят Беларуси добывать нефтяное сырье на протяжении всего XXI века и обеспечивать свои потребности на уровне 5—6 процентов.

Выявлены в ходе работ на нефть две залежи свободного газа в пределах Припятского прогиба (Красносельское и Борщевское месторождения). До практической добычи далеко, а вот использование попутного газа, который переводится в сжиженное состояние, у нас уже сегодня стопроцентное.

Добыча торфа будет снижаться, хотя его доля в топливном балансе остается все еще значительной. Республика обеспечена запасами торфа на 40 лет вперед, поэтому проведение значительных объемов разведочных работ на торф не планируется.

Каменного угля у нас нет, а вот залежи бурого имеются. Угли Бриневского и Житковичского месторождений доступны для использования, глубина залегания 20—80 м. Со временем могут быть введены промышленные мощности по добыче 1 млн. тонн угля в год для обеспечения объектов энергетики и коммунально-бытового сектора.

Есть также разведанные запасы горючих сланцев в районе Любани и Турова. Из-за высокой зольности самое перспективное использование их в топливно-энергетической и химической промышленности — перегонка с целью получения отопительного газа, мазута, толуола, сольвента. А зола пойдет на производство керамики, наполнителя для бетонов, для известкования почв.

Новое направление для республики — это использование термальных вод в районе Брестской впадины и в Припятском прогибе. Пока конкретных предложений по геологическим наработкам нет, но время идет, и многое может измениться.

— А какова судьба солигорского калийного региона?

— Вполне проработана по перспективе добыча калийной соли с учетом внутренних потребностей и поставок за пределы страны. Доразведка Старобинского месторождения, детальная разведка Октябрьского и уточнение запасов Петриковского месторождений позволят ПО «Беларуськалий» работать в долгой перспективе с ежегодной добычей в 30 млн. тонн.

Разведанные запасы каменной соли позволяют говорить, что потребности республики в этой продукции обеспечиваются полностью, выполняются заказы по экспорту.

Имеются значительные перспективы по гипсу, доломитам, сапропелям, фосфоритам, глаукониту, силицитам, керамическим глинам, строительным пескам и гравию, строительному камню, сырью для цементного производства.

— Беларусь перспективна на железные руды. Верно ли это утверждение?

— Предварительно разведано Околовское месторождение железистых кварцитов, а Новоселковское с запасами титано-магнетитовых руд находится на стадии поисковой оценки. Руды перспективны для использования РУП «БМЗ», и предстоит выбрать наиболее рентабельный вариант отработки одного из месторождений.

В последние годы все более актуальное значение приобретает проблема золотоносности недр республики. Золото имеется в песчано-гравийном материале, калийных солях и железных рудах. Необходимо продолжать работы по поискам промышленных месторождений благородных металлов в коренном залегании, а также оценить рентабельность попутного извлечения золота, платины, серебра при разработке рудных полезных ископаемых и месторождений песчано-гравийного материала.

Геологами на территории нашей страны выделен ряд перспективных районов для поисков коренных месторождений алмазов. Эти специфические структуры — трубки взрыва выявлены на востоке Беларуси, есть перспективы их обнаружения на севере республики. Кимберлитовые трубки располагаются на глубине, поэтому их поиск ведется с помощью аэромагнитной съемки.

В породах ряда трубок (исследовался керн скважин) выявлены зерна мелких алмазов, а также минералы-спутники, сопутствующие алмазам в месторождениях России. Многоплановые исследования позволяют надеяться, что в Беларуси в недалеком времени возможно открытие промышленного месторождения алмазов.

— Наша республика считается богатой водой — не случайно называют ее озерным краем. А пьем все мы воду далеко не лучшего качества.

— Велики в Беларуси запасы подземных пресных вод. Их эксплуатационные объемы составляют 6,4 млн. м³ в сутки. Это означает, что Минск, областные центры, крупные города и городские поселки могут получить качественную артезианскую воду из глубоких водоносных горизонтов. Появляется возможность исключить использование поверхностных вод для питьевого водоснабжения.

Достаточно велики также запасы разнообразных по составу минеральных вод — есть сульфатно-хлоридные, хлоридно-сульфатные, сероводородные, железистые, радоновые. В лечебных целях их используют многие санатории и здравницы, работают цеха по разливу лечебных питьевых и лечебно-столовых минеральных вод.

Потенциальным сырьем для получения йода, брома, других редких элементов являются высоко минерализированные подземные рассолы хлоридного типа из глубин Припятского прогиба.

Зіхоткія формы святла



“Аркадзь, уставай! Аркадзь, уставай!” — кліча мяне мама з гарышча хаты, дзе я сплю. “Устаю, устаю...” Прыўздымаюся на ложку, але вочы не расплюшчваюцца, і я зноў валюся на падушку. Праз некаторы час мама стукае качаргой у столь. “Уставай, уставай, сынок. Ужо сонца ўзышло. Карову я падаіла, пара гнаць пасвіць”. — “Устаю, мама, устаю”. І гэтак некалькі разоў — цяжка падняцца пасля ўчарашняга дня.

Усё вытрымала наша Рабая: бадзянне па чужых вёсках, лагер у лесе, пераход лініі фронту і паход у тыл нашых войскаў, наш тыф, у час якога карову даглядалі чужыя людзі. Мы мучылі яе, а яна ратавала нас ад галоднай смерці.

І вось вызвалены ад немцаў Вялікія Літвінавічы. Мы прывялі карову дадому. Усё наша згарэла: і самая вялікая ў вёсцы хата, і аграмадны хлеў, кладоўка, істопка, і ўся жыўнасць, у тым ліку 17 вулляў пчол. Засталіся студня ды чорныя пячныя коміны. Дзед Васіль (мамін бацька) — працаўнік, вядомы па ўсёй акрузе бондар, памёр ад сыпнога тыфу ў Глускім раёне. Згарэлі дзядулева і бабуліна труны, крыжы, якія загадзя падрыхтаваў дзед. Дзеда пахавалі, загарнуўшы ў коўдру”,— успамінае Аркадзь Патапавіч Новік, дзіця вайны.

А я ўглядаюся ў твар гэтага сталага чалавека, ведаючы, што перада мною — мастак, думаю-разважаю пра ролю жыццёвых перыпетый у лёсе творчага чалавека. Новік — творца, радзіма якога — Гомельшчына, вёска Вялікія Літвінавічы, Калінкавіцкі раён. Багатая на гістарычную памяць старонка!.. Што да Вялікіх Літвінавічаў, то вядомасць яны маюць з XVI стагоддзя... Гісторыкі сведчаць: да вайны тут адных ветраных млыноў было ажно 3. І ўсім знаходзілася праца.

Вайна збэсціла жыццё Аркадзя Новіка, сваю пячатку на яго наклала. Ды падлетак, куды б яго лёс ні закідваў, вызначаўся творчым мысленнем. На пачатку 1950-х, адслужыўшы на флоце, патрапіў у Ленінград. Так склалася, што там і правёў значную частку свайго жыцця. Ужо ў 1971 годзе закончыў Ленінградскае вышэйшае мастацка-прамысловае вучылішча імя В.Мухінай. І выбраў адно на ўсе часы захапленне — малыя формы дэкаратыўна-прамысловага мастацтва. Матэрыял — шкло.

І хаця творчы рост у горадзе на Няве складваўся ў Аркадзя няблага, увесь час цягнула на радзіму. У 1984,

маючы за плячыма ўдзел амаль у 20 выставах, усё ж вярнуўся ў Барысаў. Не знайшоўшы сталай працы (у Барысаве ёсць шклозавод, мастацкі камбінат — таму і рваўся сюды мастак), працаваў на кухні аднапакаёўкі. А гэта — кампрэсар, газавая гарэлка, пастаянна (узімку, у любую непагадзь) адчыненае акно. Ды і ў холад без ватоўкі, валёнак, парытройкі світэраў не папрацуеш. У 1990 годзе майстра прынялі ў Беларускі саюз мастакоў. Але і гэта не паўплывала на ўмовы работы. Майстэрні ніхто Новіку не выдзеліў. А між тым адна з яго мінскіх выставак у Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва мела добрыя водгукі...

Аркадзь Новік не адчайваецца. Улюбёны ў Беларусь, у родную прыроду, ён захоплена і апантана множыць, выяўляе ў шкле сваё светабачанне. Кампазіцыі “Залатая восень”, “Маё Палессе”, “Лета”, “Табун” вартыя знаходжання ў прэстыжных музеях. Бегемоты, слонікі, пеўнікі, выкананыя ў самых розных колерах, сабраныя разам нагадваюць тэатральнае відовішча. Жывёльны свет захапляе мастака. Ён шматкрат імправізуе, уводзячы ў вобразы звяроў і птушак лаканічныя і разам з тым красамоўныя дэталі. І разам з тым захоўвае класічнасць формы, ніколі не ўносячы ў работы элементы бязглуздзіцы. Шкляныя скульптуры Аркадзя Новіка ўражваюць дабрынёю, пранікліваcцю, суперажываннем аўтара сваім персанажам.

Яшчэ адзін абсяг мастацкіх росшукаў майстра — кветкі. Творца не выпрабляе ружы альбо заморскія дэкаратыўныя расліны. Мілыя вобразы роднага краю мастак знаходзіць у барысаўскіх ваколіцах, у згадках дзіцячай памяці, на лецішчы ў вёсцы Навасады. І чаго там толькі няма! Пчолы з 34 вулляў — яшчэ адно захапленне, што трымае Аркадзя Патапавіча ў жыцці! — збіраюць салодкія скарбы з астраў ды настурак. З календулы і рамонка. З вяргінь... Пазіраеш на шкляныя букеты — быццам дыван з кветак, вытканы з мелісы і аксамітак, цыній ды браткаў... І ўсім шкляным (а мне здаецца, быццам самым сапраўдным) кветкам знаходзіць свой колер.

Кветкі, якія адлюстроўваюць уяўленне Новіка пра Беларусь, уражваюць, прыцягваюць да сябе. Магнетызуюць сваімі шклянымі пералівамі. Багацці прыроды дзякуючы таленту Аркадзя Патапавіча становяцца багаццямі мастацкімі.

...А ведаючы рэчаіснасць, тое, у якіх умовах ствараюцца высокага кшталту творы, шкада, што такія няўважныя мы да яркай і патрабуючай увагі з'явы. У Беларусі, між іншым, шкляныя мануфактуры маюць багатыя традыцыі. Працуюць шклозаводы і зараз. Ды і ў прафесійным мастакоўскім саюзе не так шмат рупліўцаў, якія займаліся б толькі мастацкім шклом. Вольга Сазыкіна, Людміла Мягкова, Уладзімір Мурахвер, Аляўціна Масенка, Таццяна Малышава, Марыя Князева... Лічы, і ўсё.

...Аркадзь Патапавіч доўжыць і доўжыць у маім рэдакцыйным пакоі расповед пра сваё ваеннае маленства: “... Спёка. Аваднi і сляпні высмоктваюць з жывёлін апошнюю кроў. Я б'ю крывасмокаў рукамі, сцябаю кароў галінкамі па худых баках. Каровы ледзьве цягнуць плуг. “Ану, мілыя! Ану!”

Але вось наша Рабая апускаецца на пярэднія ногі і кладзецца на зямлю. Мама зноў кідае плуг і падбягае да жывёл. Мы выпрагаем кароў з ярма. Мама плача і кляне Гітлера. Праз некаторы час Рабая ўстае і я падганяю кароў, трэба дааpаць гэтыя клятыя 20 сотак — штодзённую норму...”.

Слухаю загартаванага жыццём мастака, шкляных спраў майстра. Слухаю і думаю, а мо ўсё ж знойдзецца і яму падтрымка ў няпростых прафесійных, творчых варунках.

Алесь ЗАБАЛОЦКІ.
Фота Аляксандра ЛАБАДЫ.

На пороге опасности?

Человек начал активно воздействовать на природу в середине восемнадцатого века, с началом промышленной революции. С той поры, утверждают исследователи, среднемировая температура выросла на 0,8 градуса. Допустимое повышение — 2 градуса. Продолжая расти, она может дойти до критической. Осталось всего лишь чуть больше одного градуса до катастрофы. Процесс потепления ускоряет накопление углекислого газа в атмосфере. Через десять лет его будет столько над нами, что процессы станут необратимыми.

Чтобы остановить механизм бомбы замедленного действия, ученые призывают развитые страны переходить на возобновляемые источники энергии, увеличить затраты на научные исследования и внедрение низкоуглеродистых технологий, ограничить выбросы углекислого газа в атмосферу.

Первая по экобаллам — Финляндия

В Давосе были представлены данные сравнительного анализа сохранения природы в разных странах. На первом месте — Финляндия, затем следуют Норвегия, Уругвай и Швеция. Россия занимает 33 место, а Северная Корея — на 146.

Анализ делался по 21 показателю: разнообразие природных ресурсов, успешность экологической политики, качество воды, работа с отходами производства и быта и другим.

Здоровье Нарочи — здоровье людей

Все крепко связано. Будет хорошо с озером Нарочь и нарочанским краем и людям будет хорошо. Такие задачи должна решить в ближайшие годы программа оздоровления знаменитого озера. В этой работе объединяются государство, профсоюзы, все те, кто заинтересован в разумной эксплуатации природных богатств. Заповедный статус национального парка при этом обеспечивается в полной мере. Планируются строительство и модернизация очистных сооружений, вывод из прибрежной зоны сельхозпредприятий, запрещение распашки в этой зоне земель, вырубки леса и кустарников, наведение порядка в санаториях, домах отдыха и туристических лагерях различных ведомств.

В этой программе может принять участие каждый, кто приезжает к Нарочи: не оставлять после себя мусора, кострищ, не выбрасывать в воду отходы, не браконьерствовать.

На 46-м году…

В Международной книге Белых носорогов он стоял под третьим номером. И был самым старым во всей Европе. Родился в Южно-Африканской Республике, а в Польшу попал из Германии. Зулу в прошлом году отметил свое сорокапятилетие — рекордный возраст, прожил еще шесть месяцев и на том завершил жизненный путь. В зоопарке Лодзи не стало достопримечательности.

Рядом с нами стовековая реликвия

Мы привыкли к мысли, что кошки живут рядом с нами примерно четыре тысячи лет. Но вот французские ученые раскопали на Кипре погребение, которому 9500 лет. Рядом с человеческими останками лежал скелет кошки. Таким образом установлено, что человек подружился с кошкой (или наоборот) значительно раньше, чем считалось до сего времени.

Привередливые комарихи

Пьют нашу кровь не комары, а их самки. Мужское население этого племени питается лишь нектаром.

Но не каждого человека любят комарихи. Как выяснили британские ученые, организм отдельных людей вырабатывает вещество, от которого насекомые просто воротят нос в сторону. И сейчас в дальнем зарубежье настойчиво ищут, как выделить такое вещество, которое не нравится женскому полу комаров, чтобы успешно защитить человечество от вечной напасти.

Предъявите генетический паспорт

В мире известны 1,5 миллиона видов животных и полмиллиона — растений. Но это только часть того, что живет на Земле. Ученые утверждают, что цифры следует увеличить в четыре-пять раз. И искать, искать и изучать.

Однако на исследовательском пути немало трудностей. Одна из них — идентификация видов. Существующие методы исследования занимают немало времени и требуют узконаправленных знаний. Чтобы легче было работать, ученые задумались над созданием генетического паспорта, который будет включать фрагменты карты генома, фотографии, подробное описание и другие сведения.

Пятьдесят исследователей из двадцати пяти стран начинают работу над созданием генетического паспорта птиц, морских пресноводных и растений Республики Коста-Рика.

Стихия в роли археолога

Огромные волны цунами в декабре минувшего года изменили контуры Бенгальского залива. Бед принесли немало. Но они, вынеся со дна тысячи тонн песка, обнажили останки древнего города.

Люди увидели величественных гранитных львов, которые некогда охраняли город, каменный барельеф слона и другие скульптуры.

Дравидский город Махабалипурам в далекие века до новой эры считался очень богатым. Боги завидовали жителям. Зависть превысила все остальное, и они наслали на него наводнение. С 2002 года археологи искали этот город, и вот волны цунами открыли его.

В очереди на исчезновение

Всемирный союз охраны природы опубликовал удручающие данные своих исследований: в очереди на исчезновение стоят более 12 тысяч видов животных и растений. Браконьерство, осушение болот, вырубка лесов, природные катастрофы уносят тысячи и тысячи живых существ, представителей растительного мира, и нет пока еще силы в мире, способной преодолеть это земное явление, которое можно охарактеризовать как цивилизованное варварство.

Сыроватка – прадукт, вядомы ўсім. У вёсцы гэтую мутнаватую вадкасць, утвараемую пры скісанні малака, дадаюць у цеста замест вады. А яшчэ яе пускаюць на корм жывёле ці, не шкадуючы, выліваюць.

СПРЭЧНАЯ СЫРОВАТКА

У маштабах асобнай гаспадаркі пара літраў сыроваткі – дробязь. Праблема паўстае тады, калі малочныя прадукты пачынаюць вырабляцца ў прамысловых маштабах. Сыроватка, якая ў вялікіх колькасцях застаецца на малочных камбінатах, хлебазаводам і жывёлагадоўчым комплексам не патрэбная. Ім прасцей узяць ваду з крана, чым траціцца на стварэнне асобнай сістэмы дастаўкі сыроваткі, якая дрэнна захоўваецца. Не спрыяе папулярнасці сыроваткі і яе здольнасць акумуляваць прысутныя ў малацэ мікраэлементы. З аднаго боку, гэта нядрэнна, бо тварог з малака, надоенага недзе ля Нароўлі, радыенуклідаў не ўтрымлівае. З другога боку, пасля вырабу тварагу ў сыроватцы "мірнага атама" колькі заўгодна.

Адыходы, якія немагчыма скарыстаць, трэба знішчыць. Аднак у выпадку з сыроваткай зрабіць гэта без шкоды для навакольнага асяроддзя немагчыма. Раскладанне прысутных у гэтым прадукце арганічных рэчываў патрабуе непамернай колькасці кіслароду. Адна тона сыроваткі, скінутая ў каналізацыю, стварае для ачыстных сістэм тую ж нагрузку, што пяцьдзесят (!) тон побытавых сцёкавых водаў. У дадатак, прадукты раскладання сыроваткі вылучаюцца агрэсіўнасцю. У сантэхнічных сістэмах яны выклікаюць хуткую карозію абсталявання. Трапляючы ў ваду, радыкальна парушаюць экалагічны баланс і ставяць прыродныя сістэмы на мяжу выжывання.

Шкода, якая наносіцца сыроваткай навакольнаму асяроддзю, зрабіла яе утылізацыю галоўным клопатам вытворцаў малочных прадуктаў усяго свету. Як вырашаецца гэтая праблема ў Беларусі, на прадпрыемствах якой за год назапашваецца мільён тон гэтага віду малочных адыходаў?

Адказ на гэтае пытанне я атрымаў ад **Канстанціна АБ'ЕДКАВА** – кандыдата тэхнічных навук, загадчыка лабараторыі малочных прадуктаў Беларускага навукова-даследчага інстытута мясной і малочнай прамысловасці.

– З пункту гледжання тэхнолагаў, сыроватка – надзвычай каштоўная сыравіна. Яна ўтрымлівае палову сухіх рэчываў малака – амаль усю лактозу (малочны цукар) і шырокі спектр мінеральных рэчываў. У развітых краінах абязводжаная сыроватка замяняе сухое малако ў шакаладзе, хлебных і кандытарскіх вырабах. З яе вырабляецца такі папулярны прадукт як малочны пратэін. Спартсменам гэтае рэчыва дазваляее хутка нарасціць мышцы, людзям з лішкам вагі – зняць пачуццё голаду, цяжка хворым – стабілізаваць вуглевадародны абмен і ўзмацніць імунітэт. Агульная колькасць прадуктаў, якія атрымліваюцца ў працэсе утылізацыі сыроваткі, перавышае дзве сотні.

На жаль, у Беларусі гэтая вадкасць па-ранейшаму застаецца хутчэй шкодным адыходам, чым сыравінай. Трохі больш за дваццаць працэнтаў яе ідзе на корм жывёле. Яшчэ прыблізна столькі ж высушваецца. Усё астатняе трапляе ў каналізацыю ці ў бліжэйшыя рэкі, пазбаўляючы ваду кіслароду і насычаючы яе кіслотамі, цяжкімі металамі ды радыенуклідамі.

Што горш, працэс забруджвання навакольнага асяроддзя адыходамі малочнай прамысловасці набірае абароты. Прычын таму некалькі. Па-першае, змяншэнне попыту на малочны цукар зменшыла колькасць сыроваткі на яго выраб. Па-другое, айчынныя прадпрыемствы павялічваюць выпуск сыроў. Па-трэцяе, магчымасць перапрацоўкі сыроваткі абмяжоўвае прысутнасць у ёй радыенуклідаў. У выніку з дзвюх соцень тон сыроваткі, збіраемай штодня ў адным толькі Мінску, утылізуецца не больш за дзесяць працэнтаў.

Нязначнасць гэтай лічбы выклікае непакой ужо таму, што першая ў СССР лінія утылізацыі сыроваткі была створана менавіта ў Беларусі. У 1939 годзе майстар слуцкага завода, што вырабляў сыры, наладзіў выраб з адыходаў спірту-сырцу. У тым жа годзе Савет Міністраў СССР выдаў пастанову аб паўсюдным ужыванні гэтай тэхналогіі. На жаль, вайна і выкліканая ёй разруха зрабіць гэта не дазволілі.

Наступная спроба наладзіць утылізацыю экалагічна шкодных адыходаў была зроблена ў 1970-м. Распрацоўка адпаведнай тэхналогіі была даручана Усесаюзнаму навукова-даследчаму інстытуту масла- і сыраробства (г. Угліч, Расія). Аднак да канца гэтую справу так і не давялі.

Наш інстытут праблемай утылізацыі сыроваткі займаецца з пачатку 90-х гадоў. Вынік гэтай працы – тэхналогія, якой з 1995 года карыстаецца Пружанскі малочны камбінат. Сыроватку там утылізуюць стопрацэнтна. З тоны гэтага прадукту атрымліваецца 15—25

Навіны экалогіі

***

Сёлета, першы раз пасля 1947 года, антарктычныя айсбергі былі заўважаны каля берагоў Новай Зеландыі. Пятнаццаць лядовых гор памерам да трох кіламетраў, дрэйфуючых у бок Паўднёвай Амерыкі, сталі чарговым сведчаннем прыспешанага таяння снежнага шчыта Антарктыды.

***

Пастанова Савета Міністраў №1623, што дзейнічае з 1 студзеня 2005 года, зацвердзіла новы спіс пасяленняў і аб'ектаў Беларусі, аднесеных да зоны радыеактыўнага забруджвання. Колькасць населеных пунктаў у гэтым дакуменце, параўнальна з папярэдняй яго версіяй, зменшылася на 122 і склала 2653. Лічба аб'ектаў скарацілася ад 80 да 74.

З улікам гэтых змен колькасць асоб, залічаных да жыхароў забруджаных радыяцыяй раёнаў, складае 1 341 356. За апошнія тры гады яна паменшала на 122 500.

***

У Пекіне адкрыўся першы завод па перапрацоўцы харчовых адыходаў. На працягу дня кухні гатэляў, рэстаранаў ды іншых установаў сістэмы харчавання будуць пастаўляць яму 200 тон недаедзеных кавалкаў.

Для перапрацоўкі 1200 тон харчовых адыходаў, што збіраюцца ў мегаполісе за дзень, у 2005 годзе пекінскімі ўладамі будзе збудавана яшчэ пяць падобных прадпрыемстваў.

***

Колькасць бяздомных сабак у Маскве мясцовыя санітарныя службы ацэньваюць у 30–35 тысяч. Нягледзячы на значнасць гэтай лічбы, адказнасць за 77% выпадкаў нападаў на людзей нясуць дамашнія сабакі, пераважна агрэсіўных парод.

***

Экалагічны парк "Трапічная выспа" адкрыўся на тэрыторыі былога ваеннага завода ў 70 кіламетрах ад Берліна. За чатыры гадзіны знаходжання ў цэху зборкі дырыжабляў, пертвораным у цяпліцу, можна выкупацца ў возеры,

літраў спірту, а таксама 200 літраў альбумінавага малака і 300 літраў барды. Два апошнія прадукты – добры кармавы дабавак для жывёл.

Станоўчая рыса распрацаванай намі тэхналогіі – экалагічная чысціня атрыманых з яе ужыткам прадуктаў. Канешне, для далёкіх ад Чарнобыля Пружанаў гэта неістотна. А вось малочнаму заводу ў Хойніках штодзённыя 150 тон забруджанай радыенуклідамі сыроваткі лепш было б перапрацоўваць...

Як бачыце, эфектыўна і з карысцю перапрацаваць экалагічна небяспечныя адыходы магчыма. На жаль, малочны камбінат у Пружанах – адзінае ў краіне прадпрыемства, якое займаецца гэтай справай.

Чаму утылізацыя шкоднага для навакольнага асяроддзя прадукту не стала масавай? Аб сутнасці гэтай праблемы я даведаўся ад **Мікалая ХАНЦЭВІЧА** – намесніка дырэктара ААТ "Пружанскі малочны камбінат".

– *Адзін з прадуктаў утылізацыі малочных адыходаў – спірт. З аднаго боку, яго продаж робіць перапрацоўку сыроваткі прыбытковай. З другога, дазваляе браць з нашага прадпрыемства падаткі тыя ж, што і са спіртзавода.*

Тыя, хто ставяць нас у гэткія ўмовы, забываюць: спірт – пабочны прадукт працэсу знішчэння экалагічна небяспечнага рэчыва. З гэтай прычыны рэнтабельнасць яго вытворчасці мінімальная. Калі б перапрацоўка малочных адыходаў на этанол была выгаднай, спіртзаводы ў якасці сыравіны карысталіся б дармавой сыроваткай, а не купленым за валюту збожжам.

Мы – не спіртзавод і не перарабляем харчовыя прадукты на гарэлку. Мы робім іншае – вырашаем сваю частку праблемы нацыянальнага маштабу. Паводле маіх разлікаў, стварэнне спецыялізаванага цэха, аналагічнага нашаму, каштавала б дзяржаве чатыры мільёны долараў. Наша прадпрыемства не чакала дапамогі ўрада. Сістэму ачысткі небяспечных стокаў мы стварылі за ўласныя сродкі і зрабілі яе працу рэнтабельнай.

Як бачыце, ад пачатку сваёй працы наш цэх перапрацоўкі сыроваткі выконвае дзве важныя функцыі. Па-першае, ён засцерагае экасістэмы ад забруджвання. Па-другое, дазваляе зберагчы збожжа, якое Беларусь прывозіць з-за мяжы. З дзесяці тон малочных адыходаў атрымліваецца столькі ж спірту, колькі з тоны імпартнай пшаніцы. Нягледзячы на гэта нам кажуць, што "вы займаецеся не сваёй справай" і абкладаюць падаткамі. Нядзіўна, што іншыя вытворцы малочных прадуктаў займацца перапрацоўкай сыроваткі не збіраюцца. Ім прасцей выліць яе ў каналізацыю. Ну а вынікі гэтага для навакольнага асяроддзя вядомыя.

На думку скептыкаў, штогадовы мільён тон малочнай сыроваткі для маленькай Беларусі можа стаць прычынай экалагічнай катастрофы. На думку аптымістаў – фактарам здароўя нацыі.

Нягледзячы на парадаксальнасць апошняй думкі, менавіта на яе навялі мяне словы, пачутыя падчас сустрэчы з Канстанцінам Аб'едкавым.

– *У мінулым годзе наш інстытут пачаў працу над новым для Беларусі прадуктам – лактулозай. У развітых краінах яна прызнана прэбіётыкам нумар адзін, і таму выпрабляецца масава. Гэта нядзіўна, бо раствор лактулозы – ідэальнае асяроддзе для біфідабактэрый. Тых самых, прысутнасць якіх робіць малочныя прадукты па-сапраўднаму карыснымі для чалавека. Трыпяць грамаў лактулозы, атрыманыя чалавекам з малочнымі прадуктамі на працягу дня, грунтоўна паляпшаюць мікрафлору сістэмы стрававання. Яны спрыяюць размнажэнню біфідабактэрый, якія нармалізуюць страваванне і выдаляюць з кішэчнага тракту небяспечныя для здароўя мікраарганізмы.*

У распрацаваным намі працэсе сыравінай для вырабу лактулозы служыць сыроватка. Магчыма, хаця б гэта пазбавіць яе статуса забруджвальніка навакольнага асяроддзя?

Падрыхтаваў Уладзімір ПАНАДА.

пазагараць на пляжы і наведаць джунглі, у якіх жывуць "тубыльцы".

***

Нашэсце саранчы на Нігер знішчыла культурныя расліны на тэрыторыі 200 000 гектараў. Адваротным бокам гэтай з'явы стала абвальнае падзенне кошту пражэрлівых насякомых. Смажаная саранча, страціўшы раней статус рэстараннага далікатэса, стала звыклай ежай сялян.

***

Выйшла ў свет лакалізаваная версія электроннай гульні Zoo Tycoon 2 (распрацоўшчык — Microsoft). Гэты эмулятар заапарку дазваляе не толькі назіраць за жывёламі. Яго ўладальнік можа адправіцца на фотасафары ці нават будаваць звярынец на ўласны густ. Дадатак да гульні — змястоўная энцыклапедыя жывога свету.

***

У Мілане (Італія) адбыўся суд над гаспадаром фірмы, занятай утылізацыяй прамысловых адыходаў. З 1986 па 1995 гады гэтае прадпрыемства прыняло 75 000 тон таксічных рэчываў, паабяцаўшы перапрацаваць іх на паліва, аднак абавязкаў не выканала. У 1995 годзе раёны захавання адыходаў былі абвешчаны зонамі экалагічнага бедства. Іх дэзактывацыя каштавала правінцыі Ламбардыя 50 мільёнаў еўра.

Афіцыйна

У Нацыянальным прэс-цэнтры Рэспублікі Беларусь адбылася прэс-канферэнцыя, прысвечаная Сусветнаму дню вады. У ёй прымалі ўдзел спецыялісты Мінпрыроды, міністэрстваў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аховы здароўя, Мінскага гарвыканкама і Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў.

Па рашэнні Генеральнай асамблеі ААН, з 2005 года пачынаецца дзесяцігоддзе "Вада для жыцця". Беларусь не застанецца ўбаку ад праблем, звязаных з воднымі рэсурсамі. Працягваецца міжнароднае супрацоўніцтва ў гэтай галіне з Расіяй, Украінай, Літвой, Латвіяй, Польшчай, іншымі краінамі.

Беларусь забяспечана воднымі рэсурсамі. На яе тэрыторыі працякае больш за 20 тысяч рэк і ручаёў, ёсць больш за 10 тысяч азёр, 143 вадасховішчы, каля 1500 сажалак.

У краіне дзейнічае праграма "Чыстая вада". Яна вырашае праблемы водазабеспячэння, якасці паверхневых і падземных вод, эксплуатацыі ачышчальных збудаванняў; распрацоўваюцца дакументы па ахове водных аб'ектаў.

За мінулы год спажыванне вады не павялічылася. На душу насельніцтва яно складае 220 літраў у суткі.

Асобая ўвага – праблеме сцёкаў. У адкрытыя вадаёмы сёння трапляе менш за 1 працэнт неачышчаных вод. Расце магутнасць ачышчальных збудаванняў. Яны ўведзены ў эксплуатацыю ў Гродна, Гомелі, Лявічах, Скідзелі, іншых гарадах. Дзякуючы гэтаму палепшыўся экалагічны стан некаторых водных аб'ектаў. Але праблем хапае, многія ачышчальныя збудаванні перагружаны.

Акрамя Мінска і Гомеля, якія забяспечваюцца паверхневымі водамі, населеныя пункты Беларусі атрымліваюць ваду з падземных крыніц. 50 працэнтаў усіх свідравін – з павышаным утрыманнем жалеза і марганцу.

Перавод сельскіх населеных пунктаў на цэнтральнае водазабеспячэнне, добраўпарадкаванне зон адпачынку вакол вадаёмаў; распрацоўка праектаў для вялікіх і сярэдніх рэк – над гэтымі і іншымі пытаннямі працуюць сёння спецыялісты міністэрстваў і ведамстваў, навукоўцы.

Примула



